# На тым тыдні...

✓ **1 сакавіка** ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» адкрылася **выстаўка ізраільскага фатографа Дафны Таль «Цвёрдая Вера: Праваслаўе на Святой Зямлі»**, прысвечаная 25-годдзю ўстанаўлення дыпламатычных зносінаў паміж Рэспублікай Беларусь і Дзяржавай Ізраіль.

✓ **2 сакавіка** ў мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» з нагоды 25-годдзя дыпламатычных стасункаў Рэспублікі Беларусь і Італьянскай Рэспублікі і ў межах Года культуры Сардзініі ў Беларусі склалася **праграма «Беларусь – Італія: праз культуру да дыялогу і стварэння»** аб супрацоўніцтве Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў і Універсітэта Кальяры (Сардзінія).

✓ **2 сакавіка** ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Якуба Коласа ладзілася **літаратурна-музычная вечарына «Вобраз мілы, поўны чараў...»**. Тым разам у дом класіка завіталі гераіні аўтарскай праграмы Валянціны Стэльмах «Галерэя» на Першым нацыянальным канале Беларускага радыё – мастачка Святлана Мацвіенка, чэмпіёнка свету па вышэйшым пілатажы Валянціна Яікава, вучоны сакратар Цэнтральнага батанічнага сада НАН Беларусі Людміла Ганчарова, мастацкі кіраўнік народнага ансамбля «Радзімічы» Франчэска Ліпская, экскурсавод Валянціна Кароткіна.

✓ **3 сакавіка**, акурат у дзень 950-годдзя з дня першай летапіснай згадкі пра Мінск, у Музеі гісторыі горада Мінска адкрылася **новая экспазіцыя – «Мінская конная чыгунка»**. 125 гадоў таму, у маі 1892 года, па брукаваных маставых Мінска ўпершыню зацокалі падковамі коні, якія цягнулі за сабой па рэйках вагоны – гэта перавозіла гараджанаў невядомая цяперашнім пакаленням конная чыгунка, ці конка. Адкрыццё экспазіцыі стала сімвалічным падарункам жыхарам і гасцям сталіцы.

✓ **4 сакавіка** ў Музеі гісторыі горада Мінска ладзілася **бясплатная інтэрактыўная акцыя да 950-годдзя летапіснай згадкі пра Мінск.**

Музей гісторыі горада Мінска – гэта не проста адзін будынак у цэнтры горада. Гэта шэраг тэматычных экспазіцыяў, прысвечаных розным сферам гарадскога жыцця, якія размяшчаюцца ў Верхнім горадзе. 4 сакавіка 2017 года Музей назначыў са сваімі філіяламі, паказаў усе экспазіцыі і тэматычныя выстаўкі. У Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага і Гарадской мастацкай галерэі твораў Л. Шчамялёва наведнікаў чакалі незабыўныя падарожжы ў свет мастацтва, у Мінскай гарадской ратушы – цікавыя гісторыі падарожнікаў, якія праязджалі праз наш горад, у экспазіцыі «Карэтная» – пуцявыя прыгоды мінчанаў, у Археалагічным музеі адбылася сустрэча са старажытнымі мінскімі мамантамі, а ў арт-гасцёўні «Высокае места» проста панавала ўтульная творчая атмасфера.

✓ **4 сакавіка** ў Мінску прайшоў **XI форум стваральнікаў родавых сядзібаў**. Больш за 200 чалавек, якія ўжо пасяліліся ў сядзібах ці толькі рыхтуюцца зрабіць гэта, сабраліся на традыцыйную сустрэчу. У яе межах працаваў кірмаш. Ладзіліся круглыя сталы.

✓ **4 сакавіка** ў Гасцёўні Уладзіслава Галубка адкрылася **выстаўка акварэльнага жывапісу «Мы любім кветы...»**. У экспазіцыі прадстаўлены працы беларускіх мастачак Ларысы Стрыжак, Наталлі Харольскай і расіянкі Святланы Румянцавай.

✓ **9 сакавіка** ў мінскай прасторы «ЦЭХ» пачала працаваць **выстаўка карцінаў вядомых беларускіх музыкаў**. Яна заклікана паказаць розныя грані самавыяўлення творчай асобы, а таксама паразважаць над актуальнай для Беларусі праблемай свабоды творчасці і яе межаў. На выстаўцы можна ўбачыць карціны і малюнкі Лявона Вольскага, Ігара Варашкевіча («Крама»), Алега Хаменкі («Палац»), Юрыя Стыльскага, Андруся Такінданга («Recha», «Harotnica»), Ганны Ждапавай (квартэт «Lilac»), Алеся Таболіча («Znich»), Сяргея Скрыпнічэнкі («Żygimont Vaza») і Аляксандра Дземідзенкі («Relikt»).

Выстаўка працуе да 19 сакавіка.

✓ **9 сакавіка** ў Нацыянальным цэнтры сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь адкрылася **персанальная фотавыстаўка Валерыя Вядрэнкі «Лошыцкі дыхрыцьш»**. Гэта вынік фотасесіяў 2004 – 2012 гадоў у Лошыцкім парку, дзе цудам захавалася старадаўняя шляхецкая сядзіба, першае ўзгадванне пра якую датуецца 1557 годам. Сёння Лошыца – музейна-паркавы комплекс.



*На фота Наталі КУПРЭВІЧ: Валерый Вядрэнка*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ